

Забытые и никому не нужные...

Когда приходит старость и немощь, вдруг начинаешь понимать, что ты уже никому не нужен: ни детям, ни внукам, ни родному колхозу.

См. стр. 2



Не зарастае сцежка памяці

22 мая 2002 года споўнілася15 гадоў з дня смерці слыннага нашага земляка, пісьменніка і журналіста Васіля Фёдаравіча Праскурава.

См. стр. 2



Кветкі ёсць, а агуркоў няма

Як атрымаць добры ўраджай агуркоў? Можна, безумоўна, спадзявацца на выпадак, але лепей усё ж выкарыстаць парады спецыялістаў.

См. стр. 4

газета выдавецкага дома «Інтэкс-прэс»

Ганцавіцкі час

час праўдзівых навін

№ 1 (1) Пятніца, 24 мая 2002 г. Выдаецца з 24 мая 2002 г.

Навіны

Хто на чарзе?

18 мая на агульны сход калгаснікаў, што адбыўся ў Любашаве, было вынесена пытание рэфармавання калгаса «Радзіма».

Прапанову Уладзіміра Столяра далучыць калгас да ААТ "Харчавік" калгаснікі адхілілі. Ім далі пэўны тэрмін падумаць над гэтым і зразумець: калгас "Радзіма" ў сённяшнім варыянце больш існаваць не будзе.

Тут «дагаспадарыліся» да таго, што атрымалі не прыбытак ад сельгасвытворчасці, а займелі запазычанасць перад дзяржаўнай суб'ектамі гаспадарання на суму каля 400 мільёнаў рублёў. І даўгі гаспадаркі працягваюць расці. У 2000 годзе яны павялічыліся на 25 мільёнаў рублёў, у мінулым — на 22 мільёны. Каб скасаваць іх, калгасу трэба працаваць задарма, не робячы ніякіх затрат і не выплочваючы заработную плату сельскім працаўнікам 2-3 гады.

У апошні час, нягледзячы на прыхарошванне спраў у сельскай гаспадарцы мясцовымі вертыкальшчыкамі, калгасы раёна ледзь-ледзь зводзяць канцы з канцамі, а некаторыя апынуліся на мяжы банкруцтва. Такі ж лёс незўабаве чакае і другога банкрута — калгас "Бальшавік". Гэта падспудна прызнаў у адным са сваіх публічных выступленняў і старшыня райвыканкама Уладзімір Столяр, які шчыра прызнаўся: "Ад калгаса "Бальшавік" на сённяшні дзень засталася адна толькі назва..."

Дарэчы, з кожным годам колькасць калектыўных гаспадарак у Ганцавіцкім раёне з-за іх фінансава-эканамічнай несамастойнасці змяншаецца. Некалькі гадоў таму назад быў ліквідаваны і далучаны да "Парыжскай камуны" адзін з першых пасляваенных калгасаў раёна "Сцяг Леніна". Хто на чарзе?

Міхась АЛЕШНЫ

Хочешь заработать – плати

В понедельник утром, 20 мая, в городском сквере,что в двух шагах от дома Советов в Ганцевичах, образовалась внушительная толпа. Около 100 человек, в основном мужчин из города Ганцевичи и деревень, привела сюда одна из найважнейших проблем – безработица, уровень которой в нашем районе на одной из первых позиций в республике.



Коллаж Натальи Войновской

• В ожидании чуда...

Словно бабочки на свет, слетелись крепкие мужики на зов вербовщиков, которые представились региональными представителями информационного агентства «Престиж» из Москвы. Представителями агентства на самом деле оказались не москвичи, а наши братки-белорусы — жители Ивацевичского и Столинского районов.

Наниматели предлагали неплохие, по нашим меркам, заработки от 250 до 700 долларов США. Обещали жильё и питание, аванс в течение 10 дней. Работу предлагали на стройках г. Москвы и Подмосковья. В основном требовались каменщики, электрики, штукатуры, бетонщики, плотники — исключительно мужчины. Женщин согласились брать только бригадой. По словам Леонида Гладуна – одного из региональных представителей «Престижа», агентство работает с соблюдением законодательства Российской Федерации с 20 строительными фирмами и обязуется защищать интересы работников, в том числе при неудовлетворённости работой, агентство обещает предоставить работнику другое место.

Но прежде чем приступить к работе, представители «Престижа» предупредили, что нужно будет заплатить по 20 долларов водителю за проезд на автобусе из Барановичей в Москву, причем в твёрдой валюте, и по приезде рабочие должны внести по 1000 российских рублей (30 $) за оформление договора с информационным агентством. И только после этого предоставляется работа на строительной фирме, где по прошествии некоторого времени нужно внести ещё 600 российских рублей за регистрацию (легальное нахождение в Москве).

Естественно, соблазн записаться на работу был почти у каждого, но сомнения всё же оставались. Так, Василий Василевич, рабочий одной из частных фирм в Ганцевичах, который, как и все, пришел с надеждой получить работу, к посредникам относится с опаской.

– В прошлом году подобным образом, – говорит Василий Иванович, – набирали в Якутию. Взяли по 50 долларов и велели собраться возле гостиницы «Горизонт» для отправки и ждать автобусы. Не дождались. 280 человек тогда остались без работы и без денег.

Другой искатель заработка, Сергей, рассказал о наборе рабочих в Турцию, где обещали платить по 600 долларов, обеспечив охраной, гостиницей, договорами т.п. Тогда собрали по 200 долларов на визы, оформление документов и проезд. Деньги также испарились вместе с «работодателями».

Почти на протяжении часа активно шла беседа заинтересованных сторон. Но до записи дело так и не дошло: неожиданно появились сотрудники милиции и увезли гостей из Москвы для выяснения обстоятельств в РОВД. Отпустили их только через три часа, проверив документы и удостоверения личности.


Вернувшись в городской сквер, один из региональных представителей «Престижа» Леонид Гладун сообщил, что тревога была напрасная. По его сведениям, кто-то из райисполкома предположил, что в сквере проводится несанкционированный митинг, и позвонил в РОВД. Встреча была сорвана, а тем, кто дождался, было предложено встретиться на следующий день.

На следующий день в том же месте желающих поработать на стройках Подмосковья, собралось... 8 человек.

P.S. Согласно договору, который нам удалось получить, агентство «Престиж» не гарантирует вам трудоустройство, а лишь предоставляет информацию о вакансиях на строительных или других фирмах.

Петр ГУЗАЕВСКИЙ

Синоптики сообщают:



	25 мая		26 мая		27 мая	
	ночь	день	ночь	день	ночь	день
t,°C	+14	+27	+16	+17	+11	+17
Q,*	-4	-4	-5	-2	3	3
v, м/с	2	4	4	6	3	5

	28 мая		29 мая		30 мая	
	ночь	день	ночь	день	ночь	день
t,°C	+10	+20	+13	+19	+10	+24
Q,*	3	4	0	0	4	1
v, м/с	2	2	3	5	1	4

*тенденция давления - это разница между значениями давления в текущий срок и сутки назад, в мм рт.ст.

Внимание, конкурс!

Уважаемые читатели и любители футбола!

Вы имеете великолепную возможность принять участие в конкурсе

«Лучший прогнозист футбольного сезона 2002 года»

и выиграть в конце футбольного сезона **телевизор** и **другие призы**.

Прогнозы проводятся по итогам матчей чемпионата области по футболу с участием команды «Пищевик» г. Ганцевичи.

Каждую неделю вы сможете выиграть:

– **мяч с автографами** игроков команды «Пищевик»,
– **механические часы фирмы "Луч"** или
– **бесплатную подписку** на 1 месяц на нашу газету.

(Условия конкурса читайте в газете «Спадарожнік»)

Социум

Забытые и никому не нужные...

«Хто ж пра іх паклапоціцца?" — статью под таким названием опубликовала в конце апреля Брестская областная газета «Народная трыбуна». В ней рассказывается о том, как в Кобринском районе сельские Советы решают социально-бытовые проблемы инвалидов, пенсионеров, престарелых и немощных людей. Они непосредственно помогают этой категории населения во многих житейских делах: управляться с приусадебными участками, заготавливать сено, дрова и т.д. По моему мнению, пример Кобринского района заслуживает внимания, достоин подражания, в том числе и в Ганцевичском районе.

Не стоит много рассуждать о том, как теперь живёт-выживает вышеупомянутая категория наших граждан, — об этом писано-переписано. Но вот о проблемах конкретных людей, живущих в конкретном месте, я считаю, говорить нужно.



Фото Петра ГУЗАЕВСКОГО

•Она отдала колхозу лучшие годы жизни. А что получила взамен?

В деревне Денисковичи живёт 1584 жителя, из них 667 человек — пенсионеры. Большая часть этих людей требует к себе повышенного внимания, так как, в силу возрастных особенностей, уже не может самостоятельно управляться с крестьянским хозяйством.

Печальным примером того, как не нужно относиться к пенсионерам, служит судьба Евгения Ивановича Карпени, бывшего колхозного тракториста с 43-летним стажем, инвалида II группы, немощного 67-летнего старика. Из-за того, что ему не по силам заботы и хлопоты по обработке приусадебного участка, Евгений Иванович вынужден отказаться от дополнительного участка земли в 20 соток. Второй год его выручает сын, живущий в Ганцевичах. В случае необходимости он привозит отцу с матерью в деревню картофель из города. Не абсурд ли это? Абсурд! И нечего к этому больше прибавить...

Второй по сложности вопрос для Карпени это вопрос обеспечения коровы сеном. Сам он сено заготовить своей кормилице не в состоянии, а руку помощи родной колхоз, которому отдал свыше сорока лет, протянуть не спешит. Вот и стоит перед Евгением Ивановичем проблема: держать корову или не держать? Проблему можно было бы решить, если бы местные чиновники не чинили ему бюрократических преград.

А теперь представьте себя на месте этого немощного пенсионера с его нищенскими доходами и «рыночными» расходами — и вам, я думаю, захочется улететь, убежать, уползти хоть на край земли, хоть к чёрту на кулички — куда-нибудь, чтобы не видеть этого «рая».

Кстати, статью из «Народнай трыбуны» принёс мне сам Евгений Иванович. Видимо, эта заметка вселила в душу старика надежду, что в будущем хоть что-то изменится, и он поспешил поделиться со мной своей радостью.

Не менее драматично сложилась в этом плане и судьба колхозной пенсионерки, кавалера орденов Ленина и Трудового Красного Знамени Евдокии Петровны Швайко. Она, как и Евгений Иванович, в буквальном смысле этого слова выброшена нашей суровой действительностью за борт. Ореол славы и почестей, которыми она была окружена ранее, давно улетучился. Теперь о славной женщине-труженице вспоминают редко и то по большим праздникам. Обессиленная 79-летняя старушка, недавно перенесшая инсульт, ежедневно волочит воду за 150 метров с колодца чужого двора, чтобы приготовить себе пищу, попить водицы в конце концов! Неужели своим бескорыстным и многолетним трудом женщина-орденоноска не заслужила того, чтобы родной колхоз, которому отдала всю жизнь и силы, построил во дворе колодец? Выходит, не заслужила.

Кроме этой проблемы, у Евдокии Петровны каждый год возникает проблема обработки земли, заготовки сена для коровы, которую держит её хворовитый сын на две семьи — свою и матери. В минувшем году престарелая женщина, чтобы получить участок сенокоса была вынуждена взять на обработку делянку свеклы. Такие условия поставил орденоносцу родной колхоз. Бесчеловечные, прямо скажем, условия.

Особо мне хочется выделить одну человеческую судьбу — судьбу 70-летней пенсионерки, интеллигента с большой буквы, бывшей учительницы Денисковичской средней школы Марии Ефимовны Суприянович. Нет слов, чтобы описать все мытарства пенсионерки, которые она переносит ежегодно при обработке приусадебного участка, для поддержания порядка в своей коммунальной квартире! Её пример – это яркий пример того, как не нужно обходиться нашему обществу с сельской интеллигенцией. Если мы этого не поймём, то уже в скором будущем будем вынуждены зафиксировать «клиническую смерть» этой прослойки нашего общества.

Заканчивая эту сложную и многогранную тему, которую мне подсказала сама жизнь, я хочу сказать следующее: судьбы Евгения Ивановича Карпени, Евдокии Петровны Швайко, Марии Ефимовны Суприянович как в зеркале отражают судьбу многих пенсионеров и отношение нашего общества к ним.

Вячеслав ТРЕПАЧКО, бывший председатель колхоза «Россия» д. Денисковичи

Даты

Не зарастае сцежка памяці

22 мая 2002 года споўнілася 15 гадоў з дня смерці слыннага нашага земляка, пісьменніка і журналіста, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі, лаўрэата прэміі Саюза журналістаў СССР, Заслужанага дзеяча культуры БССР, былога рэдактара ганцавіцкай раённай газеты "Савецкае Палессе" Васіля Фёдаравіча Праскурава.



Фота аўтара

•Ушанаваць памяць славутага земляка прыйшлі бібліятэкары ЦРБ

Сёння добрае імя знакамітага ганцаўчаніна носіць цэнтральная раённая бібліятэка, вуліца ў Ганцавічах, на якой ён жыў. Памяць В.Ф. Праскураву ўвекавечана ў мемарыяльных дошках, устаноўленых на будынку рэдакцыі і ягоным доме.

Кароткае, але яркае жыццё пражыў гэты цудоўны чалавек. Ён успыхнуў на літаратурным небасхіле і згарэў як факел, асвятліўшы дарогу многім журналістам і пісьменнікам. Яго вучнямі і сябрамі былі знакамітыя паэты, вядомыя на Беларусі і за яе межамі людзі: Міхал Дубянецкі, Сяргей Дзяршаў, Міхась Рудкоўскі, Іван Кірэйчык, Віктар Гардзей, Мікола Купрэў, Мікола Антаноўскі. Яго дружбай даражылі народныя паэты Беларусі Ніл Гілевіч і Аркадзь Куляшоў. Неаднойчы парог яго гасціннага дома пераступалі славутасці беларускай літаратуры Уладзімір Калеснік, Барыс Стральцоў, Сяргей Грахоўскі, Янка Брыль, Ніна Мацяш, Святлана Алексіевіч, Мікола Пракаповіч, Алег Лойка, Алесь Каско, Васіль Зуёнак, Алесь Жук, Піліп Пястрак, Юрась Свірка, украінскі паэт Пятро Мах... Ды ці пералічыш усіх, хто меў гонар пасядзець у праскураўскай хаце за гасцінным сталом, дзе было ўсё: і хлеб, і да хлеба!

Мне таксама пашчасціла працаваць з Васілём Фёдаравічам. Поплеч мы прайшлі ў адной рэдакцыі 20 гадоў. І гэтыя незабыўныя гады сталі для мяне гадамі творчай вучобы, накаплення прафесійнага майстэрства. І сёння тым, чаго дасягнуў, што маю і магу, я ў многім абавязаны яму, Васілю Фёдаравічу Праскураву.

Лёс адмераў Васілю Фёдаравічу кароткі зямны шлях. Усяго 60 гадоў. Але і за гэты час ён паспеў зрабіць столькі колькі другому і за пяць жыццяў не адолець. Ён пакінуў пасля сябе багатую публіцыстычную і літаратурную спадчыну, сваё непаўторныя па стылі напісання, па шматколернай каларыйнасці роднай мовы кнігі "Трое з-за Лані", "Святая сівізна", "Людзі-суседзі", "Пакажы чалавеку дарогу", "Пакланіся зямлі-карміцельцы", "Чорны хлеб", сваю пасмяротную кніжку "Наўсцяж вясковай вуліцы". Амаль усе згаданыя кнігі, не збаюся гэтага выразу, — гэта класіка сучаснай беларускай нарысістыкі.

У апошнія гады жыцця Васіл Фёдаравіча , які меў дастаткова багаты журналісцкі вопыт, давёў да вышэйшай дасканаласці веданне роднай мовы, пацягнула на мастацкую прозу. І гэта ў яго атрымлівалася. Дастаткова згадаць такія яго мастацкія творы, як "Рута-мята", незавершаную аповесць "Наўсцяж вясковай вуліцы". Яны — сведчанне самабытнага пісьменніцкага таленту.

Акрылены поспехам, Васіль Фёдаравіч пісаў і хацеў пісаць. Па начах у вокнах ягонай хаты доўга не тухла святло. Там, у цішыні невялікай залы, абсталяванай пісьменнікам пад рабочы кабінет, нараджаліся новыя творы.

Незадоўга да сваёй смерці, у пачатку 1987 года, Васіль Фёдаравіч шчыра прызнаваўся: "Вельмі люблю пісаць. Проста не магу жыць без гэтага. Некаторыя з маіх нарысаў (асабліва "Людзі-суседзі", "Пакажы чалавеку дарогу") добра былі сустрэты крытыкай. Што я сам думаю аб іх? Прызнаюся шчыра, як на споведзі: усё гэта толькі трэніровачныя ўзоры той вышыўкі, якую я хачу, якую павінен зрабіць".

У гэтых словах увесь Васіль Фёдаравіч Праскураў. Аднак лёс бязлітасны. На самай вышыні творчага ўзлёту яго жыццё абарвалася. Шкада. Няздзейсненымі засталіся многія задумы, недапісаныя творы. Але і тое, што засталося нам у спадчыну, гэта вялікая каштоўнасць, якая ўзбагаціла нацыянальную літаратуру. Гэтай спадчыне наканавана доўгае жыццё.

Кастусь МОХАР

Пра родную мову і не толькі...

Адной з сваіх апошніх пастаноў Міністэрства адукацыі РБ адмяніла абавязковыя экзамены па беларускай літаратуры і замежнай мове. Вучні задаволены (замест 6 трэба здаваць 4 экзамены), некаторыя настаўнікі – таксама. Яны сцвярджаюць, што ў жыцці беларуская мова нікому не спатрэбіцца, а да экзамена па замежнай мове даволі цяжка падрыхтавацца... Складваецца ўражанне, што апошняе рашэнне Міністэрства адукацыі адпавядае чаканням большасці насельніцтва.

Але скажыце, калі ласка, каму будзе патрэбны спецыяліст, які не валодае ні замежнай, ні роднай мовай? Адракаючыся ад сваёй мовы, чалавек страчвае карані, гэтак жа, як і расліна, якая без каранёў гіне. Некаторы час могуць працягвацца паездкі на заробкі ў Расію. Праўда, ці не ганебна лічыцца чалавекам 2 гатунку ў першапрэстольнай? І ці паважаюць чалавека, які здраджвае сваёй Бацькаўшчыне (непавага да гісторыі і літаратуры роднай краіны, знявага да нацыянальных святынь вельмі набліжаецца да здрады). Ці не здаецца вам, што мы гінем павольна ўжо зараз і не заўважаем гэтага?

Шлях на згортванне палітыкі нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі пачаўся ў 1996 годзе пасля надання рускай мове статусу дзяржаўнай. Далейшыя падзеі: барацьба з няўгоднымі пісьменнікамі, паступовае згортванне колькасці беларускамоўных класаў у школах, негалосная забарона на стварэнне беларускамоўнай ВНУ яскрава сведчаць аб нежаданні ўладных структур выпраўляць або мяняць існуючае становішча.

Апошняя падзея – інтэрв'ю галоўнага рэдактара "Інфармацыйнага бюлетэня Адміністрацыі Прэзідэнта РБ" пісьменніка Эдуарда Скобелева, які прызваў кіраўніцтва літаратурна-мастацкіх часопісаў не друкаваць творы Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна, Ніла Гілевіча і Сяргея Законнікава як "палітычна адсталых" ("БДГ", 18 мая 2002 года, № 70) – канчаткова замацавала ўсе кропкі над "і".

Ці ёсць выйсце з дадзенай сітуацыі, у якой нашы грамадзяне апынуліся не па сваёй волі? Безумоўна. Размаўляць і вывучаць родную мову пакуль, дзякуй Богу, ніхто не забараняе. Родная мова – тая ж маці, ад яе не адракаюцца!

Юрый КРЭМЕНЬ

Кожны абавязаны берагчы гісторыка-культурную, духоўную спадчыну і іншыя нацыянальныя каштоўнасці.

Артыкул 54 Канстытуцыі РБ

Калі пачуем радыё?

Амаль восем гадоў мы дабіваемся, каб на нашу вуліцу Сасновую (раён сельгастэхнікі) падвялі радыёлінію. Але марна. Доўгачаканае радыё ў нашых дамах да гэтага часу маўчыць. Праўда, летась справа як быццам бы зрушылася з месца — работнікі раённага вузла электрасувязі абследавалі вуліцу, склалі каштарыс на правядзенне радыёлініі. Але на тым усё і скончылася. Доўгачаканых радыёкропак у нашых дамах так і няма. Можа вы, паважаны "Спадарожнік", дапаможаце нам у вырашэнні гэтай праблемы?

Іван ЛАГВІНОВІЧ

Ад рэдакцыі. **Атрымаўшы такое пісьмо, мы тэрмінова звязаліся з начальнікам раённага вузла электрычнай сувязі Мікалаем Сяргеевічам Рылкам.**

– Я ўпершыню ад вас даведаўся аб такой праблеме. Заўважу, яе наогул не існуе. Любому жадаючаму мы хоць сёння можам устанавіць радыёкропку!

Што ж датычыцца скаргі Івана Лагвіновіча, то ён асабіста да мяне не звяртаўся. Запрашаю яго і іншых жадаючых да нас у РВЭС, і мы вырашым гэтае пытанне.

В «Белнефтехиме» – спад производства

Экономический спад в концерне «Белнефтехим» затронул, прежде всего, предприятия химического комплекса. Так, на четверть снизило производство продукции могилевское ПО «Химволокно». В гродненском «Химволокне» в марте производство составило лишь половину от прошлогоднего объема. Всего на 80 процентов выполнило правительственное задание светлогорское ПО «Химволокно». На этом предприятии и сейчас нередки остановки производства, мощности недогружены. Администрацию этого химического гиганта, где занято почти 10 тысяч работников, пугает обещанный визит Александра Лукашенко. Недавно генеральный директор провел производственное совещание, на котором приказал срочно найти покупателей химических волокон, чтобы разгрузить склады. 14-тысячный коллектив бобруйской «Белшины» с 1 по 15 мая находился на каникулах. В марте предприятие провалило государственный план. Спад производства составил 20 процентов. Заместитель генерального директора предприятия Виктор Ялок отказался комментировать причины спада. Вполне вероятно, это вызвано тем, что положение руководства шинного комбината довольно шаткое. Президент концерна «Белнефтехим» Иван Бамбиза, сам получивший предупреждение от Лукашенко, заявил на днях о персональной ответственности руководителей предприятий за показатели работы. По итогам полугодия он пообещал провести кадровую чистку.




Фото IREX Pro/Media

• Нефть – основное сырье концерна «Белнефтехим»

Процесс по делу Чигиря-старшего начался

Суд над бывшим премьер-министром Беларуси Михаилом Чигирем начался 21 мая в суде Фрунзенского района Минска. Председательствовала на процессе судья Наталья Вареник. Об этом сообщила супруга Михаила Чигиря Юлия, которая является его юридическим защитником. Уголовное преследование экс-премьера длится с апреля 1999 года, когда Чигирь участвовал в кампании по выборам президента Беларуси, объявленной Верховным Советом 13-го созыва. Восемь месяцев Чигирь провел в следственном изоляторе. Бывший руководитель правительства был обвинен в превышении служебных полномочий за предоставление незаконной отсрочки по таможенным платежам фирме «Пиаск»; по остальным четырем эпизодам его оправдали. 19 мая 2000 года Минский городской суд приговорил Чигиря к трем годам лишения свободы с отсрочкой исполнения приговора на два года.


Фото IREX Pro/Media

• М.Чигирь во время суда

Чигирь обжаловал приговор в Верховном суде, который отменил приговор и направил дело на новое расследование. В результате Чигирю предъявлены обвинения в служебной халатности, а также в неполной уплате подоходного налога с заработной платы во время его работы руководителем представительства немецкого концерна «Гея» в Москве. Однако экс-премьер и его защитники заявляют, что ему не нужно было платить налоги в Беларуси, поскольку он проживал за пределами страны. Обвинение в служебной халатности выдвинуто в отношении Чигиря в связи с выплатой одной из канадских фирм авансового платежа в размере 1 млн. долларов США для строительства нового здания «Белагропромбанка» в 1994 году. Первоначально по этому эпизоду его обвиняли в хищениях в особо крупном размере. Однако городской суд во время процесса 2000 года оправдал его. Во время дополнительного расследования следствие пыталось прекратить уголовное преследование экс-премьера по этому эпизоду в связи с истечением срока давности, однако Чигирь и его защита посчитали, что уголовное преследование должно было быть прекращено за отсутствием состава преступления. В результате обвинение по этому эпизоду было переквалифицировано.

Валютные берега

В апреле чистые иностранные активы (валютные резервы) Нацбанка выросли почти на 35 млн. долларов и составили на 1 мая 235 млн. долларов. Об этом сообщили в управлении информации Нацбанка. По словам специалистов, это связано со стабилизацией курса белорусского рубля, что позволило банку сделать упор на наращивание валютных резервов.

Ставки снижаются

С 21 мая до 50 процентов уменьшена базовая ставка рефинансирования и учетная ставка Национального банка.

По данным Минстата, темп роста потребительских цен в апреле составил 2,9 процента, а за две недели мая – всего 0,9 процента.

Среднемесячная инфляция за март и апрель составила 2,8 процента, а потому ставки и были понижены с 55 до 50 процентов годовых.

Ограничим свободу совести?

В ближайшие дни в Беларуси может быть принят новый закон, регулирующий религиозные процессы и взаимоотношения церкви и государства. Существующий проект по сравнению с ныне действующим законодательством, скорее ограничивает, нежели обеспечивает свободу совести граждан, и многие уже назвали его политическим.

Пятый раз за год

В Беларуси произошло пятое в нынешнем году повышение цен на белую водку. По уже сложившейся традиции стоимость этого алкогольного напитка вновь возросла на 2,5 процента. Теперь в розничной продаже, например, пол-литровая «винтовая» бутылка водки «Кристалл-100» стоит 2310 рублей (ранее - 2260), «Белая Русь», «Кристалл-люкс» - 2390 (2330)... С начала года водка подорожала на 13,1 процента, а потребительские цены в целом увеличились на 16,4 процента.

Фонд «Детям Чернобыля» получил предупреждение

Белорусский благотворительный фонд «Детям Чернобыля» получил письменное предупреждение Министерства юстиции Беларуси. Как сообщает «Радыё Свабода», основанием для этого жесткого шага стали чисто формальные поводы. В случае вынесения еще одного предупреждения в течение года крупнейшая благотворительная организация страны может быть закрыта. Президент Фонда – профессор Геннадий Грушевой называет факт вынесения предупреждения началом новой войны властей против демократических неправительственных организаций. Формальным основанием вынесения письменного предупреждения стали несколько моментов: во-первых, на табличке у входа в офис фонда «Детям Чернобыля» не хватает двух букв – ОО (общественная организация); во-вторых, в уставе эмблема фонда изображена в цвете, а копии документов – черно-белые; в третьих, процедура утверждения руководителей региональных структур фонда, по мнению начальника управления общественных организаций Минюста Михаила Сухинина, является выборами, что противоречит уставу организации. Геннадий Грушевой полагает, что предупреждение – первый шаг к закрытию фонда, о чем хорошо известно и в Министерстве юстиции. Причина тому – особые отношения главы фонда с властями, его критическая позиция в отношении действий официального Минска по ликвидации последствий чернобыльской катастрофы и планов заселения загрязненных радиацией территорий. Шаги, направленные против фонда, могут помешать проведению летней оздоровительной программы тысяч белорусских детей в чистых регионах за пределами Беларуси. Геннадий Грушевой убежден в том, что руководство страны в условиях резкого снижения доверия граждан к действующей власти начинает новую волну борьбы с неправительственными организациями. Фонд «Детям Чернобыля» намерен апеллировать к международному сообществу с призывом повлиять на белорусские власти.


Фото IREX Pro/Media

• Геннадий Грушевой

! Коротко

По данным Министерства статистики и анализа, в апреле потребительские цены возросли на 2,9 процента, тогда как в марте они повысились на 2,6 процента. С начала года потребительские цены увеличились на 16 процентов. По прогнозу правительства и Национального банка, в нынешнем году потребительские цены должны возрасти на 20-27 процентов. Чтобы вписаться в этот прогноз, до конца года цены должны повышаться не более чем на 1,1 процента в месяц. Для сравнения: в апреле этого года потребительские цены в Молдове увеличились на 1,9 процента, в Украине – на 1,4, в России - на 1,2, в Эстонии – на 0,9, в Казахстане – на 0,5, в Латвии – на 0,1, в Литве - не изменились.

* * *

Ожидается, что Европейский Банк Реконструкции и Развития примет новую стратегию в отношении Беларуси, которая предусматривает сокращение до минимума деятельности банка в Беларуси. Представитель Банка сообщил «Радыё Свабода», что в отношении Беларуси будет употреблена приблизительно та же стратегия, которая была принята в прошлом году в отношении Туркменистана. В рамках этой стратегии Банк не дает кредиты стране, если правительство не проводит политических и экономических реформ. При этом продолжается частное финансирование малого и среднего бизнеса.

* * *

Похоже, пока откладывается явление зрителям второго национального телеканала ОНТ – общенационального телевидения. В конце марта его руководители называли сроком выхода в эфир вторую половину мая, однако на данный момент еще не завершена даже поставка необходимого оборудования, сообщает «Радыё Рацыя». Как известно, ОНТ будет «делить кнопку» с российским ОРТ. На практике для белорусского зрителя, по крайней мере, на начальном этапе, это будет означать, что ежедневно после программы «Время» в вещательную сетку ОРТ будет включаться получасовой выпуск белорусских новостей. Руководители нового канала считают, что если через три года распределение времени будет 50 на 50, то это – хороший показатель.

* * *

Делегация военного ведомства Туркменистана посетит Беларусь с целью ознакомления с возможностями военно-промышленного комплекса республики. Об этом сообщил на пресс-конференции 17 мая в Ашгабате президент Туркменистана Сапармурат Ниязов. Он не исключил того, что по результатам визита будет принято решение о закупке в Беларуси современной высокоточной военной техники и вооружения, – передает БелаПАН.


* * *

Вот уже неделю как известный композитор, певец и неизменный руководитель ансамбля «Песняры» Владимир Мулявин, попавший в автокатастрофу 14 мая, находится в научно-исследовательском институте травматологии и ортопедии, где ему была сделана сложная операция на позвоночнике и спинном мозге. На день выхода газеты никаких кардинальных изменений в состоянии здоровья Владимира Мулявина не произошло. Медики по-прежнему оценивают его состояние как стабильно тяжелое.

По материалам информационного сайта www.charter 97. org подготовил Александр ВЛАДИМИРОВ

Кветкі ёсць, а агуркоў няма

Не сакрэт, што многія дачнікі рыхтуюць расаду агуркоў дома. Калі 30-дзённыя расліны высадзілі ў маі ў цяпліцы, яны ўжо зацвілі. Вядома, людзі чакалі і ранніх спелых пладоў. А іх няма. Няма і завязі. Чаму?


Фота Яўгенія Янукевіч

• Не даглядзіш – агуркоў не будзе

Трэба паглядзець, ці ёсць на расліне жаночыя кветкі (маленькі агурочак з жоўтай кветкай). Толькі яны даюць плады. А ўсе кветкі без агурочка – пустыя. Гэта мужчынскія і ад іх не чакайце дабра. Другая прычына – нізкая ці высокая (+35 градусаў) тэмпература, а таксама высокая (ці, наадварот, нізкая) вільготнасць паветра. Пылок становіцца стэрыльным.

Трэцяя бяда – няма пчол, восаў, чмялёў, трыпсаў. Пералятаючы з кветкі на кветку, яны на лапках, жывоціку, іншых частках цела пераносяць ліпкую сперму. Дастаткова імгненнага дотыку да сардэчка жаночай кветкі, каб пайшоў працэс жыцця. Найлепш гэта адбываецца пры тэмпературы 18—29 градусаў.

Аперацыю апылення можна прарабіць і самім, калі пчолы яшчэ не знайшлі гэтага добрага меданоса. Сарвіце пустацвет, абарвіце пялесткі, дакраніцеся джалам да цэнтра жаночай кветкі. Увогуле ўсё добра відаць на малюнку.

Завязь развіваецца даволі хутка. Ужо на чацвёрты-пяты дзень відаць рост агурочка. Вядома, іншыя кампаненты (паліў, угнаенні, тэмпература), як кажуць, у норме. Звычайна, на 12-ты дзень (ці крыху пазней) можна знімаць плод.

Калі апладнення не адбылося, жаночая кветка-агурочак жаўцее і адвальваецца ці загнівае.

У перыяд масавага цвіцення, налівання і росту пладоў вельмі важна даваць раз у дзесяць дзен ці штотыднева падкормкі каравяк 1 /10, птушыны памет 1 /15. Вечарам наладжвайце душ для лісця. Гэта робіцца ў спякотны дзень і калі сонца хіліцца да гарызонта (18—19 гадзін). Душ робіцца настоенай на сонцы вадой распыляльнікам ці венічкам. Праз паўгадзіны цяплічку можна закрыць.

Дарэчы, пра час закрыцця цяплічак, дзе растуць агуркі, памідоры, перцы, баклажаны. Рабіць гэта трэба да заходу сонца, калі яно яшчэ добра грэе (не пазней як у 19-20 гадзін). Адкрываць з устойлівым цяплом – 9-10 гадзін раніцы.

А яшчэ кажуць, што на памылках вучацца

Не паспела вясна «набраць абароты», як паступілі сігналы пра «незнаёмыя хваробы» расады. Перцы і памідоры раптам пачалі «класціся».

У месцы, дзе раслінка хаваецца ў зямлю, усё нейкае чорнае. Сама сцяблінка быццам перацягнутая, падобная на нітку. Карані вельмі слабыя.

Дачнікі ведаюць, што гэта гуляе па волі так званая «чорная ножка». Хвароба грыбковага паходжання. Найбольш распаўсюджана на агародах, запльваючых балотах, увогуле там, дзе мала свежага паветра і многа вільгаці. Галоўнае – не браць для расады зямлю з агарода і нізкіх забалочаных месцаў. Больш падыходзяць тарфакрошка з высокіх бураў, зямля з крацініх норак, спецыяльны кампост з лісця. Усё абавязкова прагрэта пры тэмпературы ад 80 да 120 (па Мітлайдэру) градусаў. Тэрмін уздзеяння высокай тэмпературы – да паўгадзіны. Слой зямлі невысокі, інакш яна не прагрэецца да цэнтра.

Толькі пасля гэтай «лазні» ўносіць угнаенні (комплексныя мінеральныя – шклянку на вядро і попел – паўтары шклянкі. А яшчэ дадаткова тры лыжкі суперфасфату і столькі ж аміячнай салетры). Усе старанна перамяшаць, дадаўшы да трэці плавіння, якое праляжала пад даждом ці снегам, зноў жа абавязкова прапаранае.

Верагоднасць з'яўлення «чорнай ножкі» будзе зведзена да мінімуму. Але не поўнасцю. Яшчэ важна высяваць насенне як мага радзей (радкі – 1-1,5 см адзін ад аднаго, на такой жа адлегласці і самі зярняткі). Своечасова пікіраваць (пры з'яўленні сапраўднага лісціка), не залівць вадою, ставіць на самае сонечнае месца пад адчыненай фортачкай. Выкарыстоўваць ваду, якая адстаялася суткі-двое, дабаўляць марганцоўку (яркі ружовы колер).

Пра ўсе гэтыя «мерапрыемствы» мы гаворым на працягу сезона ці не дзесят разоў. Акрамя ж перцаў памідораў, «чорная ножка» палюе на ўсе віды капусты, некаторыя іншыя культуры. Але, як відаць, свае памылкі мы не выключаем, а бадай што множым...

Радыска заўжды дарэчы

Хто не каштаваў свежанькай, толькі з градкі радыскі? Хрумсткая, сакавітая, з гарчынкай... Дадаць крышачку кропу, цыбулі (пер'е), пятрушкі і, вядома, смятанкі. За вушы не адцягнеш ад такой стравы. А побач яшчэ летуценна выкідвае вoблачкі смачнага пару бульбачка...



Радыска, што той салдат, вельмі хуткая на пад'ем. Пасеялі месяц назад, і ўжо ідзі выбірай лепшыя плады. Некаторыя ж асобіны могуць выспець і за 25 дзен.

Што любіць гэта культура? Выдзелім некалькі кампанентаў: святло, вільгаць, перагнойную глебу. Пачынаючы з гэтых дзен да верасня, калі сонца будзе хіліцца да гарызонта, можна сабраць аж тры ўраджаі.

Тэрмін развіцця радыскі абмежаваны. І за гэты час трэба так шмат зрабіць. У «дрэннай» глебе разгарнуцца проста няма дзе. Значыць, уносіць перагной, кампосты. Няма іх – хімічныя комплексныя ўгнаенні і попел. Гною неабходна да 5 кг на кв. метр, «мінеральі» –да 50-60 грамаў. Ці даем па 20 г салетры, суперфасфату і калію.

Насенне адабраць па памерах. Маленькае адкінуць – карысці ад яго ніякай. Падыдзе самае буйнае. На квадратны метр высяваць 1-2 грамы. Глыбіня загортвання не больш як два сантыметры. Радкі мульчыраваць тарфяной крошкай. Усходы ў фазе першага лісточка прарадзіць – адлегласць два сантыметры. Пасля прарэджвання — падкормка каравяком. Лісціці «папудрыць» попелам, каб не шкодзілі ворагі, найбольш агародная блыха.

У гэты перыяд можна патурбавацца і пра сваё насенне. Самую буйную, добра сфарміраваную асобіну перасадзіць. Вядома, ад паловы да дзвюх трацей зялёнага конуса зняць. Можна пакінуць толькі адзін лісцік у цэнтры. Рабіць усе па ўзору «перасаджвання», скажам, буракоў. Расліна ажыве хутка. Мяцелкі-стрэлкі з кветкамі падвязваюць да апоры. Знязць слабыя у самым пачатку.

Старое насенне (новае павінна прайсці перыяд даспявання) высяваць на дачах і сядзібах у розныя тэрміны – да трох разоў. Увесь сезон людзі з вітамінамі. Толькі сяўбу вядуць не на адным і тым жа кавалку, а мяняюць. Скажам, пасля ранняй бульбы ці цыбулі. Вядома, абавязкова пера-капаць участак, унесці ўгнаенні. Калі суха, то абавязкова яшчэ паліць.

Лепшы сябар кулінара

Цыбуля — своеасаблівая палачка-выручалачка ў кулінарыі. Яна добра захоўваецца, робіць смачнымі самыя простыя стравы. Некалькі парад, як лепш выкарыстаць цыбулю, вам заўсёды спатрэбяцца.



Калі вы хочаце дабавіць у салату сырую цыбулю, нарэжце яе дробна і абліце кіпенем. Горыч знікне, духмянасць узмоцніцца. Нарэзаная буйнымі палоскамі цыбуля – цудоўны гарнір. Толькі, перш чым яе смажыць, пасыпце мукой або цукрам, – яна набудзе апетытны залацісты колер і не падгарыць.

Каб разрэзаная цыбуліна не засохла, яе трэба пакласці на сподачак з соллю зрэзам уніз.Цыбуля не любіць рэзкіх ваганняў тэмператур пры захоўванні. Лепш за ўсё яна захоўваецца пры тэмпературы ад плюс да мінус двух градусаў.

Есці сырую цыбулю многія асцерагаюцца з-за паху з рота. Але калі пасля яды з'есці арэх або пажаваць зярнятка кавы, выпіць кубачак кавы, паху не будзе. Рукі ж можна працерці вільготнай соллю, а потым вымыць з мылам – і таксама не будуць пахнуць.

Прыправы з агарода

1. Кроп. У якасці прыправы выкарыстоўваюць як свежыя парасткі, так і расліну цалкам. Маладыя парасткі кропу дабаўляюць ў супы, бульбу, фаршыраваную рыбу і яйкі. Кропны соус ажыўляе прасмаку многіх страў, напрыклад, варанай цяляціны, ялавічыны, бараніны. Цэлая расліна выкарыстоўваецца пры саленні агуркоў, а плады – пры квашанні капусты і прыгатаванні марынадаў. Кроп добра рэгулюе работу страўніка. Настой насення паслабляе болі у ім і дапамагае пры калітах.

2. Базілік. Валодае прыемным пахам, а яго лісты маюць асвяжальны кіславаты смак. Менавіта яны, асабліва сарваныя да пачатку цвіцення, прымяняюцца ў якасці прыправы. Базілік добра дабаўляць у супы, соусы, стравы з рыбы і... у пернікі. Але лепш за ўсе ен спалучаецца з любымі стравамі з памідораў – соусамі, сокамі, супамі-пюрэ і да т. п.

Базілік дрэнна спалучаецца з іншымі прыправамі. Выключэнне – часнок.

Прышчапляць дрэвы дапамагаюць карані

Многія дачнікі з задавальненнем прышчаплялі б новыя сарты, каб маглі дзе-небудзь раздабыць дрэўцы-донары. Між тым яны ў кожнага на сядзібе! Паглядзіце, колькі адна- і двухгадовых парасткаў. Гэта выдатны матэрыял для эксперыментаў. А на былых паселішчах, пустэчах растуць яшчэ вішні, грушы і яблыні. Хто іх выкарыстоўвае?

Ёсць і такі матэрыял – карані заснуўшых раслін. Сумны фінал наступіў па розных прычынах. Але самі карані яшчэ жывыя, поўныя энергіі і сіл. У іх кладоўках шмат карысных рэчываў для развіцця. Не выкарыстаць гэта проста грэх.

Раскапайце зямлю ля пня, адшукайце добры корань дыяметрам у тры-чатыры сантыметры, адрэжце яго з боку былога дрэва, выцягніце на 5—10 см з зямлі. Цяпер патрэбен калок, каб прывязаць наш «прышчэпак». Тыльным бокам ляза нажа ці нейкім цвердым зручным прадметам ачысціць пянек ад зямлі, добра выцерці анучкай. Абавязкова нанава зрэзаць, каб атрымалася гладкая, роўная паверхня. Нажом робім раскол у цэнтры, ставім патрэбны чаранок (ён завостраны клінам) і сцягваем ізаляцыйнай стужкай знізу ўверх. Застаецца закрыць усе раны садовым варам.

Прышчэпка на корань мае і такую перавагу: можна «пасадзіць» не маленькі чаранок, а цэлую галінку. Замацаваць яе, каб не збіў вецер Здараецца, у месца прышчэпкі ўбіваюць нават цвікі. Праз год-два галінка аддзячыць ураджаем. Такую прышчэпку можна рабіць і летам, калі чаранкі сфарміравалі пупышкі – усе як акуліроўка. Толькі лісцікі знімаць, пакідаць адны пупышкі.

Гэтым метадам можна прышчапляць не толькі яблыню, але і грушу, вішню, сліву, агрэст, парэчкі, нават капрызныя чарэшні. Спосабы прышчэпак розныя: – напрыклад, у бакавы зарэз, у расшчэп.

Варушыцеся – і будзеце з прыбыткам.

Матэрыялы паласы падрыхтаваў Аляксей ІЛЬІН

Аб'ём: 1 ум. друк. аркуш.
Адрас рэдакцыі: 225320 г. Баранавічы, вул. Савецкая, 59
Карэспандэнцкі пункт у Ганцавічах: 225440 вул. Заслонава,4. Тэл. 2-14-50
Для лістоў: 225440 г.Ганцавічы-2 а/с 15

Галоўны рэдактар Уладзімір ЯНУКЕВІЧ
Нам. гал. рэдактара Алег ПАНАМАРОЎ
Рукапісы і здымкі не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Адказнасць за дакладнасць друкуемых фактаў і падзей нясуць аўтары. Выказаныя ў дасланых матэрыялах думкі могуць не супадаць з пунктам гледжання рэдакцыі газеты і не накладаюць на яе ніякіх абавязкаў. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Надрукавана ў РУВП "Баранавіцкая ўзбуйнёная друкарня", па адрасу: вул. Савецкая, 80
Падпісана ў друк 23.05.2002 г. у 15.00. Зак. 1488. Тыраж 1000 экз. Перыядычнасць - адзін раз у тыдзень.

Заснавальнік і выдавец ТАА "Выдавецкі дом "Інтэкс-прэс", Янукевіч Уладзімір Аляксандравіч.
Пасведчанне аб рэгістрацыі N 1785 ад 19 лютага 2002 г.